УДК 398

# ВОБРАЗ БУСЛА Ў БЕЛАРУСКАЙ І СУСВЕТНАЙ КУЛЬТУРАХ

А. Г. КЛЯЗОВІЧ
Навуковы кіраўнік Н. У. ФЁДАРАВА
БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Белы бусел з'яўляецца сімвалам Беларусі. Маючы яго на ўвазе, Беларусь клічуць «Краінай пад белымі крыламі». Бусел карыстаецца асаблівай павагай у беларусаў. Паводле колераў апярэння, белы з дадаткам чырвонага і чорнага, бусел – жывы носьбіт беларускай нацыянальнай сімволікі колераў. Народная традыцыя забараняе рабіць шкоду гнязду бусла. Яго лічылі ахоўнікам жылля ад Перуна, узорам сямейнага дабрабыту, вестуном вясны. Але пакрыўджаны, ён сам можа спаліць хату.

Птушка бусел шырока прадстаўлена ў беларускай міфалогіі. Чалавек надзяляў гэту птушку шматлікімі магічнымі функцыямі. Бусел – апякун і распарадчык ураджаем, істота, якая прыносіць дзяцей, мае сувязь з продкамі. Гэта свяшчэнная птушка, якая абараняе народ ад усяго дрэннага.

Пераважная большасць фразеалагізмаў, звязаных з вобразам бусла, мае непасрэдную, цесную сувязь са старажытнымі вераваннямі, традыцыямі беларусаў, з іх народным і хрысціянскім календаром: «дзе бусел вядзецца, там шчаслівае месца»; «Святы Батрамей высылае буслоў па дзяцей». Праз адметныя рысы бусла перадаецца аблічча чалавека, асаблівасці паводзін: «нос як у бусла дзюба»; «ходзіць як бусел ля вады».

У заходнееўрапейскай і славянскай культурах вобраз бусла трывала звязаны з нованароджанымі дзецьмі. Невыпадкова, шырока распаўсюджана маляванне бусла, які нясе ў дзюбе пялёнку з дзіцём. У заходніх славян існавала павер’е, што буслы сушаць дзяцей на балтыйскім востраве Руген. Таксама існуе казка, у якой бусел выратоўвае дзяцей з гарашчай хаты. Адсюль тлумачэнне яго чорных, быццам закурванных, крылаў, чырвоных ног і дзюбы. Балгары паважаюць бусла як паломніка, які штогод прыходзіць на Святую зямлю. У старажытных рымлян бусел быў сімвалам сыноўняй пачцівасці да бацькоў.

У выяўленчым мастацтве бусел быў адным з яркіх сімвалаў перамогі над злом. Звычайна яго адлюстроўвалі ў вобразе птушкі, папіраючай нагамі зямлю. У гарадской і абласной геральдыках бусел увасабляе абаронцу дадзенай мясціны. Эмблема бусла ўваходзіла ў гістарычныя гербы нямецкіх, італьянскіх, нідэрландскіх і швейцарскіх гарадоў і зямель. Пазней яна з’явілася і на гербах Беларусі, Украіны і нават Аўстраліі.

У хрысціянстве бусел увасабляе бязвіннасць, дабрадушнасць. У славян бусел – старажытная птушка-татэм, сімвал любові да Радзімы. Такім чынам, бусел у беларускай і сусветнай культурах не проста птушка, а пэўны сімвал з адпаведнымі трактоўкамі.